# МЭЙД БАЙ АНДРЭЙ КІБІНЬ

## Рэпартаж з адзінай у Беларусі майстэрні прафесійных гітар

**Хто б мог падумаць, што любоў да гітары прывядзе да такога? Уявіце, што вы скончылі санкт-пецярбургскі ўніверсітэт і спецыяльнасць ваша — тэхналогія карабельнага машынабудавання. На свае вочы вы бачылі, як на вялікую ваду спускаюць ледакол, і вам бы судны праектаваць, але... Аднойчы вы прачынаецеся з ідэяй: «Я буду рабіць гітары па-сапраўднаму цэлы дзень, каб гэта была мая прафесія». Так, у ліхія дзевяностыя захапленне Андрэя Кібіня рокерскай музыкай не прайшло дарма — лёс прывёў у майстэрню.**
**Сёння стваральнік гітар жыве ў Гродне. Ён мае адзіную на ўсю Беларусь дробнасерыйную вытворчасць гітар экстра-класа, вартых міжнароднай арэны. Карэспандэнт «Звязды» наведала цуда-майстэрню і падгледзела, як над шасціструннымі варожаць залатыя рукі.**



### ІДЭАЛЬНАЯ ЕЛКА

У прасторным памяшканні з вялікімі вокнамі пахне лесам, свежай драўнянай стружкай. Тут робяць грыфы і карпусы гітар. Тут жа іх паліруюць, фарбуюць, сушаць і збіраюць. Андрэй Кібінь кажа, што вытворчая магутнасць дазваляе рабіць ледзь не 240 гітар за год, але за аб'ёмамі ён не гоніцца: за месяц 20 інструментаў пакуль яшчэ не выпускае. Кошты вагаюцца ад 500 долараў, цана асобных мадэляў узнімаецца ў некалькі разоў.

«Цана залежыць ад фурнітуры, пароды дрэва і таго, як доўга матэрыял сушыўся натуральным чынам. Знайсці ідэальнае дрэва — місія выканальная, але складаная. Напрыклад, елку шукаю менавіта каўказскую, і то далёка не кожны кавалак падыдзе для гітары. Важны сур'ёзны адбор», — тлумачыць Андрэй Кібінь.

І адбор сапраўды сур'ёзны. Якая парода, дзе расло дрэва, якія там былі глеба, вільготнасць, перапады тэмператур, колькі гадоў яно расло і якую таўшчыню назапашвала — усё мае значэнне. Калісьці савецкая вытворчасць рабіла танныя гітары з бярозы, але апошняя давала бедны гук. А вось клён, кедр, палісандр, арэх, чырвонае дрэва з гітарамі сябруюць.

Па кутах у майстэрні адлежваюцца запасы драўніны. Некаторым дошкам ляжаць яшчэ пару-тройку гадоў. Матэрыял для будучых гітар павінен прасохнуць. А вось і шасціструнныя, што чакаюць сваёй законнай чаргі на зборку.

Ад малявання эскізаў каркаса да знешняга аздаблення аднаго інструмента можа прайсці больш за месяц. Тут працуюць не толькі рукамі, але і галавой, асабліва вушамі. Бо кожны музыкант хоча што? Ідэальны гук — глыбокі, густы і пявучы, дастаткова магутны, моцны, інтымны. Струны ў майстэрні ставяць альбо з нейлону, альбо з жалеза. Першыя даюць мажорнае гучанне, аксаміт. Другія — больш брутальнае.



### БЕЛАРУСКАЯ ІСПАНКА І НЕ ТОЛЬКІ

«Кожная гітара — вынік матэматычных разлікаў па распрацаванай іспанцамі методыцы, дзе база — прынцыпы залатога сячэння, — кажа Андрэй Кібінь. — Інструмент — гэта хістальны контур, што мае струны, дзве апоры і дрэва. Ведаючы прапорцыі залатога сячэння, можна не толькі спрагназаваць размеркаванне гукавых хваль, але нават кіраваць імі».

Кожная гітара гродзенца па форме абсалютна іспанская. Гэта класічны акадэмічны інструмент. Таму музычныя школы і ансамблі заказваюць гітары Андрэя Кібіня партыямі, часта іх купляюць бацькі для сваіх юных гітарыстаў-навічкоў. Канешне, мінулі тыя часы, калі імпартную гітару мянялі на аўтамабіль, а гітара ГДРаўскай вытворчасці была апагеем мар любога савецкага музыканта. Але нават на сённяшні дзень з яго прынцыпам «калі ласка, усё за вашы грошы» мець, скажам, еўрапейскую гітару праблематычна. Цэны такія, быццам яе не з Германіі авіяпоштай даставілі, а везлі з самой Патагоніі на парусной шхуне. У Беларусі Андрэй Кібінь адзіны стварае інструменты належнай якасці і ў стабільнай колькасці.

Работа ў майстэрні не спыняецца, кіпіць.

«Бачыце, — клеячы ніжнюю дэку, кажа Канстанцін Бандурын, калега Андрэя Кібіня, — форма гэтай гітары будзе крыху выпуклая, — паказвае ён, прыкладаючы лінейку. — Гэта робіцца, каб павысіць яе трываласць. Тут працуе фізічны закон, паводле якога прамыя паверхні праламаць прасцей за купалападобныя. Напэўна, у школе вам прыводзілі класічны прыклад: куранё лёгка разбівае шкарлупу яйка, звонку ж яе разбіць больш цяжка».

«Гэта светлая гітара з елкі?» — пытаю.

«Так! — чую ў адказ. — А вось тыя, — ён паказвае дзясятак іншых, — цямнейшыя — з кедру. Пасля пакрыцця лакам некаторыя з іх набудуць колер шакалада з малаком. Каму як пашанцуе», — усміхаецца.

У камандзе Андрэя Кібіня тры чалавекі, такія ж улюбёныя ў творчасць, музыку, гітары. Разам яны маюць сакрэты, якія старанна захоўваюцца ў таямніцы ад іншых вытворцаў. Усё ж такі ўніверсітэтаў па гэтай справе не існуе. І напрацаваны ўласнымі рукамі і ўласнай інжынернай думкай вопыт занадта каштоўны, каб дзяліцца ім на «Ютубе».

У атачэнні класічных іспанскіх гітар заўважаю... цымбалы! Аказваецца, геаграфія гэтага інструмента шырокая: не толькі Беларусь, Польшча, Літва, але і Грэцыя, Турцыя, нават — уяўляеце! — Дзікі Захад. Беларускія ж цымбалы афарміліся за савецкім часам.

«Сёння ў Беларусі няма вытворчасці беларускіх цымбалаў. Бо завод быў, але ён даўно закрыўся, а музыканты засталіся. І перыядычна яны да мяне падыходзілі, пытаючы: «Дзе ж нашы цымбалы? Дзе?» Попыт нарадзіў прапанаванне, — кажа Андрэй Кібінь. — Выявілася, што гэта не якая-небудзь скрыня са струнамі, а сур'ёзны інструмент. Ужо восем гадоў раблю беларускія цымбалы».

### ТЭСТ НА ЯКАСЦЬ

На інструментах Андрэя Кібіня іграюць такія віртуозы, як Валерый Дзідзюля і Павел Кухта. З яго гітарамі музыканты перамагаюць на конкурсе імя Фраўчы. Апрабаваў гітару беларуса і Томі Эмануэль, майстар унікальнай імправізацыйнай тэхнікі ігры, двойчы намінант на «Грэмі». Тады падчас сваіх мінскіх гастроляў аўстраліец вельмі высока ацаніў інструмент. І амерыканскі гітарыст-віртуоз Адам Раферці таксама палюбіў іспанскую гітару ад беларуса Андрэя Кібіня. З замежных мэтраў на чарзе засталіся хіба што Эліс Купер ці Джон Пацітучы, але яшчэ не вечар.

Удзельнічае гродзенец у замежных выстаўках музычных інструментаў. Напрыклад, на франкфурцкім кірмашы Musikmesse Frankfurt — важнай падзеі для культурнага кола Германіі, куды з'язджаюцца выдатныя музычныя майстры з усяго свету, а таксама блогеры, журналісты і, канешне, музыканты. Там Андрэй Кібінь прадстаўляў Беларусь. І яго гітары суседнічалі з інструментамі вытворцаў з гучнымі імёнамі Марціна і Тэйлара.

«Адважыцца на ўдзел у такой выстаўцы вялікі азарт, заўсёды рызыка. Калі твае гітары не спадабаюцца, пра гэта сумленна напішуць на ўвесь свет — і адмоўныя моманты гарантаваны», — упэўнены ў майстэрні. Але дагэтуль гітары родам з Гродна атрымлівалі добрую ацэнку.

«Без сучка і задзірынкі, нават з лупай трэба пастарацца знайсці сляды ручной паліроўкі. У чалавека залатыя рукі, факт. Альбо гэты майстар геній, альбо ён на іспанца сваю наклейку прыклеіў», — ацаніў гітару Андрэя Кібіня стваральнік Lorance Міхаіл Стральцоў.

Цяпер шліфуюць дрэва. І сярод усяго гэтага грукання, бразгання, шоргання адчуваецца асаблівая атмасфера, якая толькі і можа быць у майстэрні, дзе залатыя рукі месяцамі варожаць над іспанскай гітарай ці беларускімі цымбаламі. Зразумела і тое, што інструменты, створаныя на механізаваным канвееры, не могуць быць, як гэтыя, жывымі.

«Крутыя брутальныя рокеры маюць традыцыю. Пасля канцэрта яны разбіваюць гітару аб сцэну. Ці не варварства гэта? Што вы ім скажаце?» — пытаю.

«Бачыце, якая справа... Крутыя рокеры разбіваюць заменныя танныя гітары. І вось гэта ўжо варварства, падман. Трэба разбіваць тыя, на якіх іграюць, любімыя, — смяецца Андрэй Кібінь, а пасля дадае: — Я скажу: разбівайце, спальвайце, знішчайце — і прыходзьце па новыя гітары!»

**Маргарыта САДОЎСКАЯ.**
**Фота БелТА.**



Чулі?

## Вучоны стварыў беспахмельны алкаголь

**Алкаголь, які не выклікае пахмелле, з'явіцца ў продажы ў найбліжэйшыя пяць гадоў. Пра гэта газеце Guardian расказаў распрацоўшчык прадукту, прафесар Імперскага каледжа Лондана і навуковы супрацоўнік Хамерсмітскай бальніцы Дэвід Нат.**

Яго вынаходніцтва, сінтэтычны спірт Alcarelle, дазваляе адчуць ап'яненне, але не выклікае такіх наступстваў, як інтаксікацыя. Цяпер Нат спрабуе ўдасканаліць формулу, каб пазбавіцца ад «не вельмі прыемнага» смаку.

Нат вынайшаў сінтэтычны спірт яшчэ ў 1983 годзе, працуючы над вывучэннем уплыву алкаголю на рэцэптары для лячэння хвароб цэнтральнай нервовай сістэмы. Alcarelle, верагодна, будзе рэгулявацца як харчовы дадатак або інгрэдыент, таму праводзяцца не клінічныя выпрабаванні, а тэставанне на бяспеку. Прадукт яшчэ не прайшоў гэтую працэдуру, так што, наракае навуковец, пакуль прадэгуставаць яго можна толькі ў лабараторыі Ната. Таксама, каб атрымаць адабрэнне ад рэгулюючых органаў, вытворцу трэба прадставіць гатовы напой. Аўтар формулы аб'яднаўся з навукоўцамі-дыетолагамі для вырашэння гэтай задачы, якая звычайна займае каля трох гадоў, але з-за ўнікальнасці Alcarelle гэта можа заняць больш часу.

## У Францыі пабудавалі першы шакаладны дом

**Для ўсіх аматараў шакаладу ў Францыі з'явілася дзіўная прапанова — шакаладны дом, які ўбачыў свет дзякуючы намаганням скульптара Жана Люка-Дэклузо.**

Для стварэння гэтага кандытарскага шэдэўра выкарысталі велізарную колькасць шакаладу. Усе госці і жыхары Францыі могуць не толькі паглядзець на гэты дом, але і правесці ў ім цэлую ноч. Тут можна як адпачыць у адзіноце, так і прыхапіць з сабой сяброў. Шакаладны дом не толькі выдатна выглядае, але і пахне ўзрушальна. Можна толькі прыкладна ўявіць, які водар какавы лунае ўнутры кожнага пакоя гэтай хаткі. Напрыклад, тумбачка з ракавінай выраблена з некалькіх відаў шакаладу.





Унутры дома ёсць усё неабходнае, каб правесці сяброўскі вечар у прыемнай кампаніі. Калі начлег у шакаладным доме не ўваходзіць у вашы планы, вы можаце проста прагуляцца па тэрыторыі вакол яго. Побач з домам знаходзіцца невялікая сажалка, у якой плаваюць шакаладныя качкі. Не ўяўляем сабе, як аматары шакаладу змогуць утрымацца, каб не адкусіць кавалачак ад гэтага цуда-доміка. Таксама цікава, як уся пабудова не растае ад цяпла.

**Іван КУПАРВАС.**

# СКАНВОРД

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**
**Па гарызанталі:** Рапан. Скаба. Эра. Тата. Абман. Баба. Расол. Зіма. Мозг. Аліса. Рак. Баланс. Мяч. Галава. Лепка. Лак. Рызыка. **Па вертыкалі:** Лакатар. Пірат. Купа. Пена. Араб. Банан. Абоз. Аўтамабіль. Алібі. Апала. Ігра. Вакса. Спявак. Ангар. Ліпа. Малы. Чака.

Сардэчна віншую сястру-гаспадыню медыка-санітарнай часці ААТ «МАЗ» **Надзею САДОЎСКУЮ** з юбілеем.
*Ад усёй душы зычу шчасця, дабрабыту, моцнага здароўя і добрага настрою і дома, і на працы.*
**Валянціна Касінская,** *г. Мінск.*

Даты | Падзеі | Людзі

**6 КРАСАВІКА**

У краіне

**1904** год — нарадзіўся (г. Капыль) Мікола Хведаровіч (Мікалай Фёдаравіч Чарнушэвіч), беларускі пісьменнік, перакладчык. Працаваў у рэспубліканскіх перыядычных часопісах. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк», Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. У 1938 і 1949 гадах быў рэпрэсаваны. Рэабілітаваны ў 1955 годзе. Аўтар зборнікаў паэзіі «Настроі», «Вайна за мір», «Усім сэрцам», аўтабіяграфічнай аповесці «Споведзь перад будучыняй», кніг нарысаў і ўспамінаў пра беларускіх пісьменнікаў «Памятныя сустрэчы», «Незабыўнае». Пісаў для дзяцей. Пераклаў на беларускую мову паэму Ш. Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры». На вершы Хведаровіча пісалі музыку вядомыя беларускія кампазітары. Памёр у 1981 годзе.

**1936** год — нарадзіўся (в. Казлякевічы, цяпер у Баранавіцкім раёне) Фёдар Пятровіч Сянько, дзяржаўны дзеяч Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. З 1979 года міністр сельскай гаспадаркі, намеснік старшыні Савета Міністраў БССР. У 1991-м прызначаны намеснікам прэм'ер-міністра СССР.

**1959** год — нарадзіўся (г. Мінск) Аляксандр Уладзіміравіч Каршакевіч, беларускі спартсмен (гандбол), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР. Чэмпіён XXIV Алімпійскіх гульняў, сярэбраны прызёр XXII Алімпійскіх гульняў. Чэмпіён і сярэбраны прызёр чэмпіянатаў свету. Уладальнік Кубка свету, Кубка кубкаў Еўропы, Суперкубка. Двухразовы ўладальнік Кубка СССР. Шматразовы чэмпіён СССР. З 1996-га старшы трэнер маладзёжных зборных камандаў Беларусі, з 1998-га — галоўны трэнер, а з 2001-га — старшы трэнер нацыянальнай зборнай каманды Беларусі. Адзін з найлепшых, а на думку некаторых спецыялістаў, самы лепшы крайні гулец сусветнага гандбола.



У свеце

**1812** год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Герцэн, рускі пісьменнік, філосаф і грамадскі дзеяч. З 1847 года ў эміграцыі. У 1853 г. заснаваў у Лондане Вольную рускую друкарню, выдаваў альманах «Полярная звезда», газету «Колокол» і іншую агітацыйную літаратуру. У 1861 годзе садзейнічаў стварэнню тайнага таварыства «Зямля і воля». Аўтар рамана «Хто вінаваты?», аповесцяў «Доктар Крупаў», «Сорока-зладзейка», аўтабіяграфічнай кнігі «Былое і думы».

**1904** год — нарадзіўся Васіль Васілевіч Меркур'еў, савецкі акцёр, педагог, народны артыст СССР. З 1937 года працаваў у Ленінградскім тэатры драмы. Здымаўся ў фільмах: «Верныя сябры», «Глінка», «Аповесць пра сапраўднага чалавека», «Ляцяць журавы» і інш. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі РСФСР.

**1909** год — палярная экспедыцыя на чале з амерыканскім даследчыкам Арктыкі Робертам Піры дасягнула Паўночнага полюса. Па іншай версіі, адкрыццё Паўночнага полюса належыць амерыканскаму падарожніку Фрэдэрыку Куку.

**1930** год — пастановай ЦВК СССР заснаваны ордэн Леніна і ордэн «Чырвоная Зорка».

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 6.31 | 19.54 | 13.23 |
| Віцебск | 6.19 | 19.46 | 13.27 |
| Магілёў | 6.21 | 19.44 | 13.23 |
| Гомель | 6.20 | 19.39 | 13.19 |
| Гродна | 6.47 | 20.09 | 13.22 |
| Брэст | 6.49 | 20.07 | 13.18 |

### Месяц

***Маладзік 5 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Арцёма, Захара, Пятра, Сцяпана, Уладзіміра, Якава.*
***К.*** *Ады, Ізольды, Вільгельма, Пятра, Часлава.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Хлопцы, якія сутыкнуліся з нестандартнай зашпількай бюстгальтара, так і цалуюцца да світання.**

— Кажуць, ты кінуў піць?
— Я табе больш скажу: не.

**Калі на рыбалцы не бярэцца, але затое наліваюць, такая рыбалка па азначэнні лічыцца паспяховай.**

Дзве сяброўкі:
— Уяўві сабе, мой мне ўчора новы «айфон» падарыў!
— Ды ты што? А якая мадэль?
— «Ленова»!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1256.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 5 красавіка 2019 года.